УДК 811.161.3’36=112.2

Г. М. Старасціна
Установа адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова», кафедра тэарэтычнай і прыкладной лінгвістыкі

МІЖМОЎНЫЯ ТРАНСФАРМАЦЫІ Ў ПРАЦЭСЕ МАСТАЦКАГА ПЕРАКЛАДУ (на матэрыяле раманаў “Палеская хроніка” Івана Мележа)

В статье рассматриваются межъязыковые трансформации как эффективный способ преодоления лингвостилистической разносистемности сопоставляемых в процессе перево-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

да языков. В результате сравнительного анализа романов Ивана Мележа «Люди на болоте», «Метели, декабрь» и их переводов на немецкий язык было выделено три основных класса трансформаций: грамматические, лексико-грамматические и семантико-содержательные.

The article deals with interlingual transformations as an effective way to overcome the lingual and stylistic heterogeneity of the languages correlated in the course of translation. As a result of the comparative analysis of the novels written by Ivan Melesh «People of the Marsh», «Blizzards. December» and their translations into the German language three basic classes of transformations were distinguished: grammatical, lexical-grammatical and semantic-content.

Ключевые слова: перевод, эквивалентность, межъязыковые трансформации, грамматические трансформации, лексико-грамматические трансформации, семантико-содержательные трансформации, белорусский язык, немецкий язык, Иван Мележ.

Key words: translation, equivalence, interlingual transformations, grammatical transformations, lexical-grammatical transformations, semantic-content transformations, Belarusian, German, Ivan Melesh.

У аснове працэсу перакладу ляжаць міжмоўныя трансфармацыі, якія ўжываюцца для дясягнення эквівалентнасці тэкстаў дзвюх моў. Л.С. Бархудараў лічыць, што "пераклад можна лічыць пэўным відам трансфармацый, а менавіта, моўнай трансфармацыяй" [1, с. 6]. Л.К. Латышаў і А.Л. Сямёнаў адзначаюць, што прынцып перакладчыцкай трансфармацыі грунтуецца "на наяўнасці ў мовах рыс семантычнага і структурнага падабенства" [2, с. 120]. Перакладчыцкімі трансфармацыямі яны лічаць "спосабы перакладу, якія выкарыстоўваюць матываваны адыход ад патэнцыяльна магчымага семантыка-структурнага паралелізму зыходнага і перакладнога тэксту" [2, с. 120]. Такім чынам, трасфармацыі варта разглядаць як спосабы дасягнення адэкватнасці перакладу, якія выкарыстоўваюцца ў працэсе пераадолення перакладчыцкіх цяжкасцей. Трансфармацыя — гэта "пераўтварэнне канкрэтнай адзінкі арыгінала ў адзінку перакладу пры захаванні інварыянтнасці зместу". [7, с. 125].

Тэма перакладчыцкіх трансфармацый знаходзіцца ў цэнтры ўвагі шматлікіх даследчыкаў у галіне тэорыі перакладу, але навукоўцы да гэтага часу так і не прыйшлі да агульнага меркавання адносна самой сутнасці паняцця трансфармацыі. Гэтым тлумачыцца вялікая колькасць класіфікацый, прапанаваных даследчыкамі перакладу, якія маюць значныя адрозненні.

Супастаўляльны аналіз арыгінала і перакладу "Палескай хронікі" І. Мележа дазволіў вылучыць тры асноўныя класы трансфармацый: граматычныя, лексіка-граматычныя і семантыка-зместавыя.

І. Граматычныя трансфармацыі, сярод якіх вылучаюць:

1. Катэгарыяльна-марфалагічныя трансфармацыі (суадносныя лексічныя адзінкі адносяцца да розных часцін мовы). Напр.: *Тут са сваім* ***няўпраўка***... [3, с. 195] — ням. "*Ich* ***komme*** *schon mit meinem eigenen Kram nicht* ***zurecht****, und nun noch das*" [4, с. 254]. Параўн.: бел. *няўпраўка* (*разм.* 'немагчымасць выканаць, зрабіць усё, што патрэбна') — ням. *nicht zurecht-*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

kommen (‘не паспець, не спраўляцца’). Назоўніку ў арыгінале адпавядае дзеяслоў у перакладзе.

2. Сінтаксічныя трансфармацыі — моўныя пераўтварэнні ў простых, складаназалежных і складаназлучаных сказах, якія выклікаюць іх структурную перабудову, а ў некаторых выпадках і сэнсавыя змены Усе яны зводзяцца да чатырох тыпаў: замен, перастановак, дабаўленняў і апушчэнняў. Напр.: *Пад вечар маці паслала яе ў склеп прынесці бульбы* [3, с. 363] — ням. *Am Abend schickte die Mutter sie in den Keller* ***auf dem Hof*** *Kartoffeln holen* [4, с. 476]. Дабаўленне ў нямецкамоўны сказ назоўніка з прыназоўнікам *auf dem Hof* выклікана неабходнасцю ўдакладнення для носьбіта мовы перакладу рэаліі *склеп*, названай у арыгінале.

II. Лексіка-граматычныя трансфармацыі (змяненне граматычнай структуры і яе лексічнага напаўнення). Гэта такія пераўтварэнні, калі слову арыгінала адпавядае ў перакладзе словазлучэнне. Напр.: *Паставіў некалькі вешак, пралажыў канаўкі, згадаўшы, што такія канаўкі рабіў* ***летась****, калі паказваў, як капаць акопы* [3, с. 198] — ням. *Er stellte einige Markierstökke auf grub Abzugsrinnen, dabei fiel ihm ein, daß er* ***im vergangenen Jahr*** *ähnliche Arbeiten gemacht hatte, als er Neulingen erklären mußte, wie man Schützengräben aushebt* [4, с. 257]. Параўн.: бел. *летась* (*разм.* ‘у мінулым годзе’) — ням. *im vergangenen Jahr* (‘у мінулым годзе’).

III. Семантыка-зместавыя трансфармацыі.

1. Антанімічны пераклад (лексічная адзінка арыгінала замяняецца ў іншамоўным тэксце словазлучэннем з процілеглым значэннем), напр.: *І сам ён — хіба ж не ведала лепш за мачыху — іншую хацеў бы, не* ***беспасажніцу****!* [3, с. 248] — ням. *Und er selber, darüber war sie sich ebenso im klaren wie die Stiefmutter — er selber hätte* ***ein Mädchen mit reicher Mitgift*** *auch vorgezogen* [4, с. 323]. Параўн.: бел. *беспасажніца* (‘бедная дзяўчына, якая выходзіла замуж без пасагу’) — ням. *das Mädchen mit reicher Mitgift* (‘дзяўчына з багатым пасагам’).

2. Кантэкстуальныя лексічныя замены.

1) Эксплікацыя, калі значэнне лексічнай адзінкі перадаецца пры дапамозе разгорнутага апісання (даецца тлумачэнне беларускамоўнай лексемы), напр.: — *Усё-такі зробяць, дзетачкі? — казаў у купцы куранёўцаў, што курылі на* ***прызбе****, Зайчык* [3, с. 288] — ням. “*Nun ist es doch soweit, Brüderchen!” sagte Saitschyk zu den Bauern, die auf dem* ***Erdwall eines Bauernhauses*** *saßen und an ihren Selbstgedrehten pafften* [4, с. 378]. Параўн.: бел. *прызба* (‘земляны невысокі насып уздоўж знадворных сцен хаты’) — ням. *der Erdwall eines Bauernhauses* (‘земляны насып сялянскай хаты’).

2) Гіпа-гіперанімічны пераклад, калі лексічная адзінка зыходнай мовы, што мае вузкае прадметна-лагічнае значэнне, замяняецца адзінкай

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

з больш шырокім значэннем ці наадварот, напр.: *Мігам успомніў, колькі Зайчык звёз вазоў, падумаў: больш, як да* ***каляд****, на сваім яму не пратрымацца!..* [3, с. 302] — ням. *Er wußte, wie wenig Fuder Saitschyk eingefahren hatte, und dachte, länger als bis zu den* ***Feiertagen*** *hält das nicht vor* [4, с. 398]. Параўн.: бел. *каляды* (‘народнае зімовае свята дахрысціянскага паходжання’) — ням. *der Feiertag* (‘свята’).

3. Стылістычныя трансфармацыі.

1) Адэкватная замена (пераклад з поўнай заменай вобразнасці пры захаванні сэнсу выразу і яго экспрэсіўна-стылістычнай афарбоўкі). Напр.: — *Слухаць нічога не хочуць.* ***Хоць*** *ты* ***кол на галаве чашы****!* [5, с. 30] — ням. *“Die wollen von nichts hören. Man könnte* ***sich den Mund fusselig reden****!”* [6, с. 29]. Параўн.: бел. *хоць кол на галаве чашы* (*праст.* ‘немагчыма пераканаць каго-н., растлумачыць каму-н. што-н., пра ўпартага чалавека’) — ням. *sich den Mund fusselig reden* (*разм. фам.* ‘нацерці сабе мазалі на языку’ [спрабуючы пераканаць каго-н.]). Унутраная форма сэнсавых адпаведнікаў не супадае, аднак нават пры ўжыванні фразеалагізма з іншай унутранай формай захоўваецца яго эмацыянальная і стылістычная афарбоўка.

2) Змяненне стылістычных канатацый (замена элементаў тэксту аднаго функцыянальнага стылю элементамі іншага стылю). Дыялектнае слова можа перадавацца размоўным, напр.: *Пакуль дзядзькі гаварылі з Міканорам, а жанкі* ***растарэквалі*** *каля прыпека, матка з Вольгай і Насцяй, а потым і з бацькам узяліся клапаціцца каля стала* [3, с. 183] — ням. *Während sich die Männer mit Mikanor unterhielten und die Frauen auf der Ofenbank* ***schwatzen****, kümmerten sich die Mutter, Wolha und Naszja, später auch der Vater um die Bewirtung* [4, с. 238]. Параўн.: бел. *растарэкваць* (*абл.* ‘разважаць, балбатаць’) — ням. *schwatzen* (*разм.* ‘балбатаць’). Беларускі дыялектызм *растарэкваць* перадаецца на нямецкую мову пры дапамозе размоўнай лексемы *schwatzen.* Такі пераклад можна лічыць стылістычна апраўданым, бо дыялектныя словы ў большасці выпадкаў надаюць тэксту адценне гутарковасці, прастамоўя, таму іх перадача на нямецкую мову пры дапамозе размоўных лексем дазваляе дасягнуць функцыянальнай раўназначнасці лексічных адзінак у тэкстах арыгінала і перакладу.

3) Страта сігніфікатыўных канатацый, калі маркіраваная адзінка арыгінала можа замяняцца нейтральнай адзінкай у перакладзе, напр.: *Ужо калі яны былі блізка і Міканор добра бачыў, што едзе Чарнушка з дачкою, з-за цагельні выплішчылася постаць з* ***жалезняком*** [3, с. 198] — ням. *Dahinter kam noch jemand mit einem* ***Spaten*** [4, с. 257]. Параўн.: бел. *жалязняк* (*разм.* ‘лапата, рыдлёўка’) — ням. *der Spaten* (‘рыдлёўка’).

4) Дэметафарызацыя (перадача вобразнай адзінкі прамой намінацыяй). Напр.: *З-за чэзлага алешніку выглянула вольная, з рэдкімі*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

купамі кустоў прагаліна, ***чубы чароту*** [3, с. 355] — ням. *Hinter dem kahlen Erlengehölz schaute eine Waldlichtung mit spärlichen Sträuchern hervor, dahinter war* ***Schilf*** [4, с. 466]. Вобразны кампанент генітыўнай метафары арыгінала *чубы* ў перакладзе апускаецца, перадаецца толькі назоўнік з прамым значэннем *чарот* / *das Schilf* (‘чарот’), што прыводзіць да разбурэння метафары і страты вобразнасці.

Такім чынам, асноўныя прычыны выкарыстання перакладчыцкіх трансфармацый — адрозненні ў лексічным складзе, граматычнай сістэме і сэнсавым аб’ёме слоў розных моў. Усё вышэй пералічанае абавязвае перакладчыка адаптаваць зыходны тэкст да нормаў роднай мовы, выкарыстоўваючы трансфармацыі.

Літаратура

1. Бархударов, Л. С. Язык и перевод: вопросы общей и частной теории переводов / Л. С. Бархударов. – М. : Междунар. отношения, 1975. – 240 с.

2. Латышев, Л. К. Перевод: теория, практика и методика преподавания : учеб. пособ. для студ. перевод. фак. вузов / Л. К. Латышев, А. Л. Семёнов. — М. : Академия, 2003. – 192 с.

3. Мележ, І. Збор твораў : у 10 т. / І. Мележ. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1983. – Т. 5 : Людзі на балоце : раман з «Палескай хронікі». – 415 с.

4. Melesh, I. Menschen im Sumpf / I. Melesh. – Berlin : Verlag Volk und Welt, 1974. – 519 с.

5. Мележ, І. Збор твораў : у 10 т. / І. Мележ. – Мінск : Маст. літ., 1983. – Т. 7 : Завеі, снежань : раман з «Палескай хронікі». – 558 с.

6. Melesh, I. Dezember, Stürme / I. Melesh // Sowjetliteratur. – 1981. – № 2. – С.10–99.

7. Старасціна, Г. М. Трансфармацыі пры перакладзе сказаў з беларускай мовы на нямецкую (на матэрыяле “Палескай хронікі” І. Мележа) / Г. М. Старасціна // Восточнославянские языки и литературы в европейском контексте : сб. ст. / под ред. Е. Е. Иванова. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2010. – С. 125–128.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова